УДК 94(476)

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ І СТВАРЭННЕ МЕСЦАЎ ПАМЯЦІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЕГЕНДЫ АБ ПАКУТНІЦКАЙ СМЕРЦІ МІТРАПАЛІТА МАКАРЫЯ)

**М. А. Сузько**
*метадыст дэканата, магістр гістарычных навук*
*Беларусь, г. Мінск, РІВШ*

*Анатацыя.* Дадзены артыкул прысвечаны ўвекавечванню памяці святога Макарыя, мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і ўсяе Русі, які азнаменаваў сябе вялікімі заслугамі для Праваслаўнай царквы і зведаў за сваю рэўнасць да праваслаўя і выкананне свайго абавязку пакутніцкі скон.

*Ключавыя словы*: свяшчэннамучанік Макарый; Праваслаўная Царква; вёска Скрыгалаў.

Мэта нашай работы – даследаванне і актуалізацыя гістарычнай спадчыны і стварэнне месцаў памяці на прыкладзе легенды аб пакутніцкай смерці мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Макарыя.

**Легенда.** Сярод праслаўленых Рускай Праваслаўнай Царквой угоднікаў Божых ёсць святыя, якія не пакінулі пасля сябе пісьмовых прац і жыццё іх недастаткова асветлена царкоўнай гісторыяй. Але памяць паводле паданняў і рэдкіх летапісаў беражэ і ўслаўляе іх жыцці ў якасці прыкладу для паслядоўнікаў. Да такіх служыцеляў Божых адносіцца і прадстаяцель Праваслаўнай Царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ), мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі, свяшчэннамучанік Макарый, які памёр у 1497 годзе [1, с. 673].

Дакладная дата нараджэння Макарыя не ўстаноўлена, вядома толькі, што нарадзіўся ён, дзесьці ў канцы першай паловы XV стагоддзя ў Вільні, ў набожнай праваслаўнай сям’і. Імя яму далі Макарый.

У некаторых жыццяпісах свяціцеля Макарыя сустракаліся звесткі, пра тое, што яго бацькі адрозніваліся шчырай верай і строгім захаваннем запаведзяў Божых, прычым яны імкнуліся і свайго сына выхаваць у правілах праўдзівай веры і бацькоўскай набожнасці.

З благаслаўлення бацькоў з маладых гадоў ён быў пастрыжаны ў манахі і нес послух ў розных манастырах Літоўскага княства. Нёс ён службу сумленна, свята верыў праваслаўнай веры. Макарый ужо ў той час праславіўся як прыклад благапрыстойнасці, непарушнай вернасці святой Праваслаўнай царкве. Будучы архімандрытам Віленскага Свята-Троіцкага манастыра, ён прывёў абіцель ў квітнеючы стан. Улічваючы яго адданасць справе веры праваслаўнай, пасля смерці Кіеўскага мітрапаліта Іоны Глезны ў 1495 годзе, саборам праваслаўных епіскапаў Вялікага Княства Літоўскага архімандрыт Макарый быў узведзены ў сан мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі. Самая важная заслуга Макарыя, як мітрапаліта Кіеўскага, заключаецца ў тым, што ён з непахіснай мужнасцю стаяў на варце праваслаўнай веры ў ВКЛ [2, с. 31].

Служэнне мітрапаліта Макарыя выпала на цяжкія часіны, калі ВКЛ знаходзілася ў стане пастаяннай вайны з татарамі. Урываючыся ў межы княства,

яны грабілі, разаралі і спальвалі ўсё на сваім шляху. З дня заснавання асобнай мітраполіі для ВКЛ рэзідэнцыя мітрапалітаў літоўскіх і рускіх знаходзілася ў Навагрудку пад абаронай непрыступных сцен. Паводле легенды, да моманту ўзыходжання свяціцеля на прастол Кіеў не наведваўся мітрапалітамі больш за сто год. Такое становішча парушала каноны. Уладыка хацеў пакласці канец практыцы, калі прадстаяцелі праваслаўнай царквы ВКЛ, маючы тытул «мітрапаліт Кіеўскі» жылі не ў сваёй сталіцы, а ў Навагрудку і Вільна. І Макарый, сабраўшы дзе якія грошы для адбудовы Сафіі Кіеўскай ды Лаўры Пячэрскай, што ў Кіеве, рушыў да свайго кафедральнага месца, дзе ён павінен быць.

За некалькі дзён да гэтага нехта прадказаў Макарыю разлучэнне яго душы з целам, але ён не паверыў. Нягледзечы на ўсе прадсцярогі і прадказанні, што гэта вандраванне будзе для яго апошнім, уладыка адпраўляецца ў далёкую дарогу па ахопленнаму вайной поўдні Беларусі, гаворачы: «Я хачу выканаць мой святы абавязак, як архіпастыр. Няхай будзе на мне воля Божая» [2, с. 33]. Праязджаючы са сваімі спадарожнікамі ўздоўж Прыпяці, свяціцель супыніўся ў сяле Скрыгалаў (сучасны Мазырскі раён) для адпачынку. Мясцовыя жыхары звярнуліся да яго з просьбай адслужыць малебен у мясцовай царкве. У час багаслужэння стала вядома, што з-пад сцен абложанага Мазырскага замка на перахоп мітрапаліта адпраўлены атрад татарскай конніцы. Як спавядае народнае паданне, прапанову жыхароў уратавацца ўладыка адверг. Ён выйшаў на амвон і звярнуўся да прыхажан: «Ратуйцеся, дзеткі, а мне няможы. Я аддаю сябе волі Божай» [2, с. 34].

Неўзабаве татары ўварваліся ў мястэчка. Пасля нядоўгай, але яраснай барацьбы малалікавыя спадарожнікі мітрапаліта былі забіты. Уварваўшыся ў храм, татары схапілі служыцеля Божага, які стаяў каля прастолу і адсеклі яму галаву і правую руку, у якой ён моцна трымаў крыж – галоўную каштоўнасць праваслаўя, а цела яго кінулі ў балота. Вось так Макарый з сапраўднай пакорнасцю, надзеяй на Усявышняга прыняў пакутніцкую смерць ад рук чужынцаў. Адбылася гэта трагедыя 1 мая (14 па новаму стылю) 1497 г.

Паколькі пры мошчах святамучаніка Макарыя адсутнічае кісць правай рукі, то ёсць падставы думаць, што свяціцель у час службы моцна трымаў у правай руцэ пацір, і нечасціўцы, не маючы сілы адняць, адсеклі руку.

Цела свяціцеля было знойдзена ў балоцістай мясцовасці паміж рэчкамі Прыпяць і Пціч праз даволі працяглы час, калі жыхары Скрыгалава вярнуліся да сваіх абрабаваных жытлаў. Нягледзечы на гарачыню, цела святамучаніка засталося нятленным.

Хутка вестка аб гібелі мітрапаліта дайшла да Кіева. Праз два тыдні на месца трагедыі прыплылі па Дняпру і Прыпяці манахі Кіева-Пячэрскай лаўры. Разам з скрыгалоўцамі яны адшукалі абезгалоўленае цела Макарыя, каб даставіць яго ў Кіеў, куды імкнулася душа мітрапаліта. Нягледзячы на спякотнае надвор’е, яно было нятленным. Калі човен з нятленным целам Мітрапаліта Макарыя плыў па Дняпру, то занялася бура. Захаваліся сведчанні, што калі паднялася бура, людзі спачатку спалохаліся і баяліся патануць. Але ў непасрэднай блізкасці ад лодкі была такая цішыня, што ўсе радаваліся і дзівіліся Божай міласці. Цела святамучаніка паклалі перад іканастасам каля іконы архістраціга Божага Міхаіла ў правым прыдзеле Сафійскага сабора. Тут жа быў пастаўлены і кіпарысавы крыж мітрапаліта.

Такая легенда, адлюстроўвае падзеі, якія адбыліся на тэрыторыі вёскі Скрыгалаў у XV стагоддзі і з’яўляюцца гістарычнай спадчынай Скрыгалава і рэгіёна.

**Памяць.** У 1547 годзе у часы мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і ўсяе Русі Макарыя II, святамучанік быў далучаны да ліку святых. Яму была складзена царкоўная служба, свяціцель Макарый стаў ушаноўвацца на абшарах усяго Вялікага Княства Літоўскага, памяць адзначаецца ў дзень яго пакутніцкага скону – 1 мая. Памяць Макарыя каштоўная і таму, што гэты свяціцель, услаўлены неўзабаве пасля пакутніцкага скону, з’яўляецца сталым нашым хадайнікам перад Богам. Нятленныя мошчы яго служылі і служаць вялікай уцехай для ўсіх праваслаўных вернікаў.

XIX стагоддзе – манархічны перыяд у гісторыі Расійскай дзяржавы і цалкам сінадальны ў гісторыі Рускай Праваслаўнай царквы. Гісторыя Праваслаўнай царквы і яе ўзаемаадносін з Расійскай дзяржавай сведчыць аб бясспрэчнай ролі веравызнанніцкага кампанента ў палітычным, сацыяльным, культурным і духоўным жыцці грамадства. У гэтых новых гістарычных рэаліях, таксама не ў меншай ступені спрабавалі ўшанаваць памяць свяціцеля Макарыя. У 1897 годзе да 400-годдзя пакутніцкага скону Макарыя ў Кіеве была закладзена царква-школа ў яго гонар, але пасля рэвалюцыі 1917 года яе закрылі і пераўтварылі ў склад. У час адраджэння храма была праведзена рэстаўрацыя, зроблены насценны роспіс, дубовы іканастас, сюды ж былі перанесены часціцы мошчаў свяшчэннамучаніка Макарыя [3, с. 212].

Да 500-гадовага юбілею свяціцеля ў Кіеве, у Пячэрскай Лаўры, адбылася багаслоўская і гісторыка-царкоўная канферэнцыя, да ўдзельнікаў якой звярнуўся з пасланнем прадстаяцель Беларускай Праваслаўнай царквы мітрапаліт Філарэт.

У Беларусі па ініцыятыве вучонага і багаслова Уладзіміра Завітневіча, а таксама жыхароў вескі Скрыгалаў у XIX ст. быў пастаўлены помнік свяціцелю, які размясціўся на высокім беразе Прыпяці і ўяўляе сабой высокую цагляную стэлу. Таксама на месцы забойства Мітрапаліта стараннямі свяшчэнніка, будучага навамучаніка Іаанна (Пашына) у 1905 годзе была ўзведзена капліца ў цэнтры вескі Скрыгалаў. Дзякуй Богу ў гады ліхалецця яны ўцалелі, але да канца мінулага стагоддзя былі ў жаласным стане.

Пасля рэвалюцыі ў Скрыгалаве будынак Свята-Нікольскай царквы быў перароблены пад клуб, але пасля храм быў вернуты праваслаўнай абшчыне, аднаўлена капліца ў гонар свяціцеля Макарыя. На жаль, у час апошняй вайны стэла і капліца былі часткова разбураны, на стэле знік надпіс-прысвячэнне. Недаўгавечнай аказалася памяць людская. Але ў Бога ніхто не забыты [4, с. 16].

У пачатку XXI ст. пачалася работа па аднаўленню капліцы і стэлы. Мецэнатам гэтых работ стаў жыхар Мазырскага рэгіена Еўжык Міхал Навумавіч. Неўзабаве пачаліся работы па ўзвядзенню новага храма Мітрапаліта Макарыя. У 2022 годзе Свята-Макарыеўскі храм быў пабудаваны. Штогод 14 мая (1 мая па старым стылі) у дзень памяці святога пакутніка Макарыя Кіеўскага здзяйсняецца Боская літургія і Хросны ход да месца яго пакутніцкага скону.

**Актуалізацыя.** У Беларусі 2022 год быў аб’яўлены Годам гістарычнай памяці, год знамянальны тым, што Беларусь узгадвала адну з важных падзей у духоўнай гісторыі – 1030-годдзе заснавання Полацкай епархіі, якая стала першай на беларускіх землях. Больш за тысячу гадоў таму, ў 992 годзе,

знакаміты старажытнаславянскі горад Полацк стаў цэнтрам кафедры. Юбілей праваслаўя стаў адной з найважнейшых падзей Года гістарычнай памяці. У краіне праходзілі шматлікія ўрачыстасці і мерапрыемствы – богаслужэнні, хросныя хады, круглыя сталы, міжнародныя канферэнцыі з удзелам вучоных, асветніцкія акцыі. Актыўна ўвекавечваюць памяць свяціцеля і зараз.

Так, 14 мая 2022 года, у дзень успаміну пакутніцкай смерці свяшчэннамучаніка Макарыя, мітрапаліта Кіеўскага, прайшло святочнае Набажэнства ў аднайменным храме ў в. Скрыгалаў Мазырскага раёна. Па благаславенні біскупа Тураўскага і Мазырскага Леаніда святочную Боскую літургію ўзначаліў благачынны Мазырскай сельскай акругі, пробашч парафіі храма прападобнага Сергія Радaнежскага ў горадзе Мазыры протаіерэй Генадзь Несцярэня. Таксама ў гэты дзень каля стэлы на месцы забіцця свяшчэннамучаніка Макарыя быў праведзены малебен.

Увекавечваюць памяць свяціцеля і ў нашы дні. 2 жніўня 2024 года парафіяне і святары Тураўскай епархіі здзейснілі водны Хрэсны ход па рацэ Прыпяць. Гэта восьмы водны сплаў у гонар святога пакутніка Макарыя, мітрапаліта Кіеўскага, які штогод праводзіцца па благаславенні біскупа Тураўскага і Мазырскага Леаніда. Маршрут сплаву праходзіў ад горада Турава – зыбкі Праваслаўя на Палескай зямлі – праз вёску Перароўскі Млынок, аграгарадок Ляскавічы, горад Петрыкаў да вёскі Скрыгалаў Мазырскага раёна, месцы пакутніцкай смерці свяшчэннамучаніка Макарыя, і да горада склаў 170 кіламетраў па вадзе. На беразе старога рэчышча ракі ў азнаменаванне завяршэння Хроснага ходу ля стэлы свяціцелю Макарыю, мітрапаліту Кіеўскаму, быў адслужаны падзячны малебен і прачытана малітва святому пакутніку Макарыю [5, с. 369].

Знамянальна, што памяць пра свяшчэннамучаніка Макарыя вяртаецца не толькі да праваслаўных Скрыгалава, але і да ўсіх беларусаў. У дзяржаўнай установе адукацыі «Скрыгалаўская сярэдняя школа імя М. І. Шлягі Мазырскага раёна» Гомельскай вобласці адводзіцца вялікая ўвага па ўвекавечванню памяці праваслаўнага святара – Макарыя. У школе існуе музей «Мой родны кут», у якім створана экспазіцыя «Мітрапаліт Макарый – ахоўнік Скрыгалава». Матэрыялы экспазіцыі дапамагаюць праводзіць мерапрыемствы па духоўнаму выхаванню вучняў. Таксама на базе школы працуе фальклорна-драматычны гурток «Спадчына».

У рамках гуртка, кіраўніком якога з'яўляецца Л. А. Майнгард, пішуцца сцэнарыі і ставяцца пастановы ў гонар свяціцеля.

Так, настаўнікам рускай мовы і літаратуры ДУА «Скрыгалаўская сярэдняя школа імя М. І. Шлягі Мазырскага раёна» Л. А. Фалінскай да сцэнарыя свята «Макарый» ў ходзе работы школьнага гуртка «Спадчына быў напісаны верш, які яна прысвяціла духоўнаму подзвігу Макарыя.

Вы паслухайце, добрыя людзі,
Слова праўды пра Мітрапаліта:
Яго імя святое ніколі не будзе
У нашай памяці, у сэрцах забыта.

Калі вораг нячыстай нагою таптаў
Шматпакутную нашу зямліцу,
Перад ворагам гэтым ён грозна ўстаў
І не даў над народам глуміцца.

З Вільні слаўнай Макарый свой шлях кіраваў
Каб праведаць святыя прыходы.
І ў тых ён прыходах найперш пабываў,
Што з татарскай цярпелі нягоды.

У мястэчку Скрыгалаў сустрэў ён людзей,
Ад чужынцаў царква іх хавала.
І Макарый у Бога прасіў,
прыціскаючы крыж да грудзей,
Каб мінулася злая навала.

Наляцелі нячысцікі зграяю чорнай,
Сталі грозна ў Макарыя патрабаваць,
Каб прызваў ён народ сагнуць спіны пакорна,
І каб веру сваю ўтаптаў ён у гразь.

У Макарыя праведны гнеў у вачах заблшчаў,
Боль ударыў у сэрца пякуча.
Толкі гневу таго паказваць ён не стаў,
Крыж узняў ён угору рашуча:

– Святы крыж не дазволіць, каб веру сваю
Мы нячыстым чужынцам аддалі!
Крыві хочаце вы! Дык бярыце маю!
Бог не дасць, каб народ вы знішчалі.
І адсеклі татары яму галаву
І па Прыпяці ў Кіеў пусцілі.
Ды скарыць не сумелі Святую царкву,
Дух народа яны не скарылі!

А на месцы на тым, пралілася дзе кроў,
Узвялі помнік удзячныя людзі.
І няхай пралятае хоць сотні гадоў,
Мы пра подзвіг святы не забудзем.

*(2016 год)*

Сярод вялізнага мноства святых Праваслаўнай царквы асобнае месца ў памяці кожнага верніка займаюць тыя, якія нягледзячы на пагрозу жыцця праведна прапаведуюць сваю веру, пакорліва моляцца і даруюць ворагам, хто пад страхам смерці не здраджвае свайму пастырскаму абавязку. І нельга дазваляць людзям забывацца на тых, хто коштам свайго жыцця садзейнічаў дабрабыту бліжніх.

Святы Макарый вядомы сваёй непахіснай верай і адданасцю праваслаўю, сваім высокім духоўным жыццём і нястомнай апекай аб сваёй пастве, яшчэ доўга будзе жыць у памяці народаў розных пакаленняў.

**Спіс крыніц і літаратуры**

1. Вялікае княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2005–2006. – Т. 2. – 2006. – 788 с.

2. Кісялёў, У. Я аддаю сябе волі Божай / У. Кісялёў // Праваслаўе. – 2001. – № 10. – С. 30–34.

3. Майнгард, Л. А. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў сродкамі фальклорна-драматычнай дзейнасці / Л. А. Майнгард // Этнопедагогика: история и современность : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Мозырь, 17–18 окт. 2013 г. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. С. Болбас [и др.]. – Мозырь, 2013. – С. 223.

4. Титов, Ф. И. Священномученик Макарий, митрополит Киевский и всея Руси / свящ. Ф. И. Титов // Тр. Киев. духов. акад. – 1897. – Т. 2, № 5. – С. 1–18.

5. Флоря, Б. Н. Макарий / Б. Н. Флоря // Православная энциклопедия: в 70 т. / под ред. Патр. Моск. и всея Руси Алексия II. – М., 2016. – Т. 42. – С. 368–381.